http://edoc.bseu.by:8080

**Радаман А. А.**
*(Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь)*

# Прывілей Новагародскай зямлі вялікага князя Казіміра Ягайлавіча 22. 07. 1440 г.[1] як крыніца агульназемскага прывілея 1447 г.

У 1991 г. пры разборы адной з раней неапісанымі дакументамі 1000 фонда («Асобныя паступленні») аддзела рукапісаў Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу навуковы супрацоўнік АР РНБ Сяргей Жэмайціс знайшоў арыгінал Прывілея Новагародскай (Навагрудскай) зямлі Казіміра Ягайлавіча 1440 г.[2], які раней быў не вядомы даследчыкам гісторыі права ВКЛ. На сенняшні дзень гэта адзіны захаваўшыйся арыгінальны абласны прывілей часоў Казіміра Ягайлавіча. У 1997 г. тэкст прывілея быў упершыню апублікаваны[3]. У 2001 г. рыхтуецца навуковая публікацыя прывілея ў Беларусі ў часопісе «Беларускі гістарычны агляд».

Знаходка Прывілея Новагародскай зямлі 1440 г. пасля доўгага забыцця важная не толькі для разумення сярэднявечнай гісторыі Новагародскай зямлі. Так, у прыватнасці, яна дапамагае лепш зразумець эвалюцыю прававой сістэмы ВКЛ і прычыны, якія прывялі да здзяй-

[1] Дата выстаўлена ў адпаведнасці з юліянскім календаром. У адпаведнасці з прынятым сёння грэгарыянскім календаром прывілей быў выдадзены 31.07.1440 г.

[2] Зараз прывілей Новагародскай зямлі захоўваецца ў 293 фондзе («Заходнерускія акты») аддзела рукапісаў Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі (Российская Национальная библиотека. Отдел рукописей. Ф.293 «Западно-русские акты». Опись 2).

[3] Першы ўспамін аб гэтым акце ў друку: Мікалаеў М. «Чынім правы вольныя...»: (Найдаўнейшы юрыдычны акт Навагрудскай зямлі) // Навагрудскі Кур'ер. 1991. № 1. С.5; першая публікацыя тэксту: Жемайтис С.Г. Привилей Новогрудской земле 1440 г. // Рукописные памятники. Материалы и исследования. Вып. 4. СПб., 1997. С. 215–225. Гл. таксама: Радаман А. Прывілей Навагародскай (Навагрудскай) зямлі вялікага князя Казіміра 1440 г. // Кантакты і дыялогі. Інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь Грамадскага аб'яднання «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў» і Грамадскай арганізацыі «Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі». 2000. № 11–12 (59–60). С.41.

снення агульнадзяржаўнай кадыфікацыі права ў ВКЛ XVI ст.[4].

Яшчэ ў 1903 г. І. Якубоўскі выказаў думку аб тым, што ў 1440 г. Казімірам Ягайлавічам быў выдадзены прывілей, з якога многія артыкулы перайшлі ў Агульназемскі Прывілей Казіміра Ягайлавіча 1447 г.[5]. Аднак гэтая здагадка тычылася магчымага існавання агульназемскага прывілея 1440 г. і як «голий здогад, досить мало правдоподібний» была адвернута М. Грушэўскім[6].

Параўнаўчы аналіз тэкста прывілея Навагародскай зямлі 1440 г. і Агульназемскага прывілея 1447 г.[7] дазваляе сцвярджаць, што прывілей Навагародскай зямлі быў адной з галоўных крыніц агульназемскага прывілея Казіміра 02. 05. 1447 г. Відавочнае падабенства назіраецца пры супастаўленні наступных артыкулаў названых прывілеяў: 1 (1440) – 3 (1447); 2 (1440) – 4 (1447); 3 (1440) – 5 (1447); 4 (1440) – 6 (1447); 5 (1440) – 8 (1447); 7 (1440) – 12 (1447); 8 (1440) - 14 (1447); 9 (1440) – 12 (1447).

Сёння можна канстатаваць, што інтуіцыя амаль не падманула І. Якубоўскага. Ён памыляўся толькі ў тым, што крыніцай Прывілея 1447 г. быў не невядомы навуцы агульназемскі прывілей, а невядомы абласны прывілей Казіміра.

---

[4] Параўнай: Matuszewski Jacek S. Statut Wladysława Warneńczyka z 1440 r. w procesie ograniczania krolewskiego prawa dyspozycji domeną ziemską w Polsce. // Czasopismo prawno-historyczne. 1985. T.XXXVII. Z.2. S.101–121; Histoire du droit social. Mélanges en hommage r Jean Imbert. Red. Jean-Louis Harouel. Paris 1989. (Rec.: Pikulska-Robaszkiewicz Anna. // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1991. T.XLIII. Z.1–2. S.184–185); Album Elemér Mályusz. Etudes Présentées r la Commission Internationale pour l'Historie des Assemblées d'Etats. [O przywilejach i swobodach stanowych]; Histoire du droit et des institutions de l'Église en Occident publiée sous la direction de Gabriel Le Bras. T.7: L'âge classique 1140–1378. Paris, 1965 (Rec.: Russocki Stanisław // Czasopismo prawno-historyczne. 1972. T.XXIV. Z.1. S.280–281).

[5] Якубовский И. Земские привилеи Великого княжества Литовского // Журнал Министерства народного просвещения. 1903. № 4. Апрель. С.272. Гл. таксама: ibidem. С.269. Прим.4: «В смоленском областном привилее 1505 г. (АЗР. I. № 213) встречаем указание на существование общеземского привилея Казимира, выданного до 1447 г. Выдан он был вероятно в 1440 г., т.е. в год вступления Казимира на великое княжение».

[6] Грушевський М. Дата привилея в.кн. Казимира // Історія України-Руси. Том V. Суспільно-політичний і церковний устрій і відносини в українсько-руських землях XIV–XVII віків. Львів, 1905. (Рэпрынт: Киев, 1994). С.643.

*Арыгінал* (на лацінскай мове): Muzeum Narodowe w Krakowie. Biblioteka Czartoryskich. Pergament № 528, vol.VIII/42 (Szelinska W., Tomaszewicz J. Katalog dokumentów pergaminowych Biblioteki Czartoryskich w Krakowie. T.1.– Kraków, 1975.– №.530. – S.228–229). ***Публікацыі з арыгінала***: Codex diplomaticus Poloniae... / studio et opera L.Rzyszczewski et A.Muczkowski.– T.1.– Varsaviae, 1847 (далей: CDP).– P.333–337 (у час публікацыі арыгінал прывілея захоўваўся ў фамільным архіве князей Радзівілаў у Небарове); Monumenta medii aevi historica res(t) gestas Poloniae illustrantia / Ed.A.Lewicki – Tomus XIV. № 7. (гл. таксама: № 76); Codex epistolaris saeculi decimi quinti./ Ed.A.Sokolowski, J.Szujski, A.Lewicki – T III. Kraków, 1894. ***Публікацыі з спісаў прывілея на старабеларускай мове***: Zbiór praw Litewskich od roku 1389 do roku 1529. Tudzież rozprawy sejmowe o tychze prawach od roku 1544 do roku 1563./ Wyd. T.Działyński – Poznan, 1841.– P.28–35 (з кодэксу Дзялыньскага); Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссией. Т. 1: 1340–1506.– СПб., 1846.– № 61. С.73–77. Як адзначаецца ў дадатку да тэксту прывілея, ен быў узяты «из рукописной Кормчей книги, писанной на лощенной бумаге, в лист, полууставным почерком, в начале XVI в. Лл.214–216, хранящейся в библиотеке графа Феликса Тарновского, в Дзикове, под № 273. В заглавии грамоты современным почерком отмечено: «Маистатъ великого короля Казимира Полскаго, великого князя Литовского и Руского, енже вложилъ съ паны радою своею, въ земли Литовской и Руской, вечно и неподвижно». У Археаграфічную камісію гэтая кніга патрапіла дзякуючы яе карэспандэнту, вядомаму славісту Шафарыку). Аб агульназемскім прывілеі 1447 г. глядзі: Якубовский И. Земские привилеи Великого княжества Литовского // Журнал Министерства народного просвещения. 1903. № 4. Апрель. С.242–247; 256–259; 267–268.